Падтрымай "Вясну" на PATREON

Справаздача па маніторынгу масавага мерапрыемства “Марш недармаедаў” у Маладэчне фота

12.03.2017 **Тэгі**: акцыі, свабода мірных сходаў

10 сакавіка 2017 года ў Маладэчне праходзіла акцыя пратэсту супраць Дэкрэту №3 “Марш недармаедаў”.

Высновы:

1. Можна адзначыць мірны характар масавага мерапрыемства цягам усёй акцыі (калі “арганізатары маюць мірныя намеры і сход мае негвалтоўны характар”). Не было гвалтоўных заклікаў ці агрэсіўных дзеянняў з боку арганізатараў і ўдзельнікаў.



2. Зафіксаваныя факты затрыманняў прэвентыўна (Раман Ганчароў), грубыя затрыманні пасля акцыі актывістаў і журналіста (усяго нам вядома пра 15 чалавек) і прыцягнення да адказнасці ў выглядзе штрафу і адміністрацыйных арыштаў ад 5 да 15 сутак, што **з'яўляюцца беспадстаўным і супрацьпраўным перасследам у дачыненні да мірных дэманстрантаў і журналістаў**. Гэта супярэчыць міжнародна-прававым стандартам мірных сходаў, узятым Беларуссю на сябе абавязкам у галіне правоў чалавека, а таксама прамой неадпаведнасцю часткова прынятай рэкамендацыі 129.90 ў рамках Універсальнага перыядычнага агляду Савета па правах чалавека ААН у адносінах да Беларусі ў 2015 годзе. Яе беларускі ўрад часткова прыняў: "важна прыняць меры да недапушчэнні ўзяцця пад варту і пераследу мірных дэманстрантаў, а таксама жорсткага абыходжання з імі з боку міліцыі ў сувязі з ажыццяўленнем імі свайго права на свабоднае выказванне меркаванняў і свабоду сходаў і неадкладна і без усялякіх умоваў вызваліць усіх, хто быў затрыманы толькі за тое, што спрабаваў рэалізаваць гэтыя правы".



3. У якасці пазітыўнай тэндэнцыі варта адзначыць прысутнасць падчас сходу 2 супрацоўнікаў міліцыі ў форменнай вопратцы, хаця большасць супрацоўнікаў праваахоўных органаў былі ў цывільнай вопратцы і іх немагчыма ідэнтыфікаваць. Трэба адзначыць, што наяўнасць формы магла спрыяць выкананню іх абавязкаў па публічнасці сваёй дзейнасці.



Звяртаем увагу, што згодна Кіраўніцтву БДІПЧ АБСЕ “Правы чалавека і забеспячэнне правапарадку падчас публічных сходаў”, распрацаванага спецыяльна для супрацоўнікаў органаў унутраных спраў, асноўныя прынцыпы аховы правапарадку падчас публічных сходаў наступныя: валоданне інфармацыяй, садзейнічанне, камунікацыя і дыферэнцыяваны падыход да ўдзельнікаў сходаў.

4. Таксама станоўчым фактарам з’яўляецца спрыянне супрацоўнікаў ДАІ бесперашкоднаму руху ўдзельнікаў мерапрыемства на пераскрыжаваннях. Толькі 2 разы яны разарвалі рух калоны на непрацяглы час, што не стварыла істотных перашкодаў.



Метадалогія маніторынгу

РПГА “Беларускі Хельсінкскі Камітэт” і Праваабарончы цэнтр “Вясна” цягам некалькіх гадоў праводзяць сістэматычнае назіранне за масавымі мерапрыемствамі на падставе распрацаванай метадалогіі маніторынгу, якая ўключае ў сябе: набор і навучанне назіральнікаў прынцыпам грамадскага кантролю, стандартам мірных сходаў і метадалогіі назірання; запаўненне анкеты назірання падчас вочнага кантролю; апрацоўка анкет і напісанне маніторынгавай справаздачы.

Анкеты назірання за масавымі мерапрыемствамі сумесна распрацаваныя праваабарончымі арганізацыямі і ўключаюць пытанні па магчымасці выканання функцыяў назіральнікаў і СМІ, адносна паводзінаў арганізатараў і ўдзельнікаў масавага мерапрыемства, супрацоўнікаў міліцыі, а таксама наяўнасць хуткай дапамогі. Назіральнікі дапускаюцца да назірання толькі ў выпадку згоды на выкананне правілаў і прынцыпаў назірання (незалежнасць і палітычная нейтральнасць; апісанне фактаў, а не меркаванняў; неўмяшанне ў падзею, за якой назіраюць; прыхільнасць да прынцыпаў права: адмова ад любых формаў гвалтоўных дзеянняў і дыскрымінацыйных практык; карэктныя паводзіны). Падчас выканання сваіх абавязкаў назіральнікі трымаюцца асобна ад удзельнікаў. Яны абазначаныя бэйджам назіральніка і сінімі камізэлькамі.

Папярэдняя інфармацыя

Праз інтэрнэт стала вядома, што ў Маладэчне 10 сакавіка 2017 года рыхтуецца сход, інфармацыя пра які шырока агучвалася ў інтэрнэце, сацыяльных сетках, а таксама праз папяровыя аб’явы на вуліцах гораду.

Падчас правядзення масавага мерапрыемства 10 сакавіка 2017 года вочна і бесперапынна ажыццяўлялі грамадскі кантроль 3 назіральнікі, якія прайшлі адпаведнае навучанне і былі абазначаныя належным чынам.

Ход масавага мерапрыемства
Падчас масавага мерапрыемства былі зафіксаваныя наступныя факты:

- Да пачатку акцыі, каля 17:40, на Цэнтральнай плошчы Маладэчна сабралося прыблізна 60 чалавек, большасць з іх - прадстаўнікі СМІ і супрацоўнікі органаў аховы правапарадку ў цывільнай вопратцы. На плошчы, спрабуючы заглушыць выступоўцаў і сарваць мітынг, бесперапынна і гучна круцілі ролікі пра пажарную бяспеку.
  Акцыя пачалася ў 18:00. Праз 10 хвілін пасля пачатку натоўп рушыў пад помнік Леніна на плошчы, дзе выступалі Анатоль Лябедзька, Юрась Губарэвіч, Віталь Рымашэўскі і іншыя ўдзельнікі. Выступоуцы патрабавалі адмяніць Дэкрэт №3. Віталь Рымашэўскі заклікаў удзельнікаў прыпыняць правакацыі ад міліцыянтаў у цывільным і людзей у нецвярозым стане.
- Падчас гэтых выступаў да людзей выйшаў старшыня райвыканкама. Ен пачаў казаць, што мерапрыемства несанкцыяванае, папярэджваў удзельнікаў аб адміністратыўным перасследзе. Таксама запрасіў ахвочых да сябе ў кабінет на размову. Сыход старшыні райвыканкама суправаджалі лозунгам “Ганьба!”. Затым адбылося зачытване рэзалюцыі і галасаванне за яе прыняцце.
- Каля 18:35 натоўп рушыў у бок будынку падаткавай інспекцыі па вуліцы Прытыцкага. Натоўп 2 разы спынілі на пераскрыжаваннях супрацоўнікі ДАІ на непрацяглы час, а астатнія разы яны забяспечылі бесперашкодны рух калоны праз пераскрыжаванні.
- На уваходзе падатковай інспекцыі арганізатары пакінулі сваі патрабаванні. А 19:00 арганізатары абвесцілі аб афіцыйным сканчэнні мерапрыемства.
- У 19:15 назіральнікі сталі сведкай затрымання: каля ўваходу ў аўтавакзал спыніўс бардовы аўтобус, адтуль выскачылі некалькі супрацоўнікаў міліцыі ў цывільнай вопратцы, распіхалі натоўп людзей, што ішлі з акцыі, выхапілі 1 з удзельнікаў і груба кінулі ў машыну.
- Колькасць удзельнікаў налічвалася да 700 чалавек. Прысутнічалі 2 супрацоўнікі міліцыі ў форме і каля 40 супрацоўнікаў без ідэнтыфікацыйных прыкмет, а таксама 5 супрацоўнікаў ДАІ.
- Удзельнікі выкарыстоўвалі лозунгі: “Жыве Беларусь!”, “Ганьба уладзе!”, “Не — дэкрэту № 3», «Лукашэнка, сыходзь!», «Баста!», «Жыве Беларусь!», «Верым, можам, пераможам!», «Нет декрету номер три – Лукашенко уходи!».
- Удзельнікі выкарыстоўвалі наступныя транспаранты і сімволіку: плакат з надпісам “Галоўны дармаед — у Драздах”, бела-чырвона-белы сцяг іі сцяг БХД.
- Не было перашкодаў працы СМІ і назіральнікаў, у той жа час пасля акцыі быў затрыманы журналіст БелаПАН Сяргей Каралевіч, а назіральнікам не прадставілі інфармацыю пра імёны і прычыны затрыманых.
- Па выніках стала вдома пра 15 затрыманых, адзін з якіх атрымаў штраф, журналіст і непаўналетні затрыманы былі вызваленыя, а астанія атрымалі арышты ад 7 да 15 сутак, з судамі ў непрацоўны дзень (Алесь Абрамовіч, Лябедзька Анатоль, Рымашэўскі Віталь, Бондар Ільля, Панамароў Аляксандр, Губарэвіч Юрась, Аўсянік Ягор, Радкевіч Яуген, Голуб Андрэй, Гмыза Александр, Гмыза Анатоль, Кавалькова Вольга і непаўналетні ўдзельік акцыі Дзяніс).

Рэкамендацыі

Супрацоўнікам праваахоўных органаў:

* спыніць практыку грубых затрыманняў і пераследу ўдзельнікаў мірных дэманстрацый, паколькі гэта супярэчыць дабраахвотна ўзятым абавязкам Рэспублікі Беларусь у галіне правоў чалавека;

* у адпаведнасці з арт.5 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб органах унутраных спраў" "дзейнасць органаў унутраных спраў з'яўляецца галоснай". Кіруючыся гэтай нормай, прапануем, каб усе супрацоўнікі ажыццяўлялі ахову грамадскага парадку падчас масавых мерапрыемстваў у форменнай вопратцы, а таксама былі пазначаныя ідэнтыфікацыйнымі сродкамі (бэйджамі ці нагруднымі знакамі);

* абазначаць кантактную асобу з ліку супрацоўнікаў міліцыі для камунікацыі з назіральнікамі, СМІ і арганізатарамі масавага мерапрыемства;

Суб'ектам, якія валодаюць правам заканадаўчай ініцыятывы:

* ініцыяваць змены ў беларускае заканадаўства з мэтай прывядзення яго ў адпаведнасць з міжнароднымі стандартамі ў галіне свабоды мірных сходаў.

Твитнуть









Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

Чатырох жыхароў Паставаў асудзілі да "хатняй хіміі" за фотаздымак з Маршу (дапоўнена)

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 20 палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO



ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

"Усё зроблена, каб паралізаваць тваю волю", — былая палітзняволеная Вольга Класкоўская

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

"Мораць голадам і холадам". Новыя сведчанні пра катаванні і акалічнасці смерці Вітольда Ашурка ў ПК-17



ГАЛОЎНАЕ



Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі трэмін па крымінальнай справе

Мужчыну асудзілі на два гады калоніі па двух дыфамацыйных артыкулах

Паўтара года калоніі прысудзілі экс-кандыдату ў прэзідэнты Андрэю Дзмітрыеву

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

Дырэктару газеты "Белорусы и рынок" Канстанціну Залатых прысудзілі чатыры гады калоніі

Да пяці гадоў калоніі. Асудзілі палітвязняў, якія вывесілі нацыянальныя сцягі Беларусі і Украіны

Дайджэст вызваленых: 12 палітвязняў у сакавіку цалкам адбылі тэрміны і выйшлі на волю

"Могуць з'яўляцца злачынствамі супраць чалавечнасці". Што азначае гэтая фармулёўка ў дакладзе ААН пра Беларусь?

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023







ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY